# Беларусь – сусветны лідар у вытворчасці вялікагрузных самазвалаў

**Беларускі аўтамабільны завод у Жодзіна займае трэць сусветнага рынку кар'ерных самазвалаў і ўваходзіць у групу вядучых сусветных вытворцаў кар'ернай тэхнікі.З 1958 года выпушчана больш за 130 тысяч адзінак кар'ерных самазвалаў грузападымальнасцю ад 27 да 450 тон, якія за ўсю гісторыю прадпрыемства былі адпраўленыя больш як у 70 краін свету.**




*90-тонны БелАЗ-75570*

**У 2013 годзе быў выпушчаны самазвал БелАЗ-75710 грузападымальнасцю 450 тон. Выпрабаваны ў Жодзіне 22 студзеня 2014 года. Машына мае наступныя параметры: даўжыня – 20 м, шырыня – 10 м, вышыня – 8 м, траты паліва – 1300 літраў на 100 км.**

## Пяць найбольшых самазвалаў у свеце ў 2014 годзе

| Мадэль | Грузападымальнасць *(метрычных тон)* | Магутнасць *(конскіх сіл)* | Ёмкасць бака *(літраў)* | Кошт млн даляраў |
|---|---|---|---|---|
| Belaz 75710 | 450 | 4600 | 5600 | 6 |
| Liebherr T 282 B | 400 | 3500 | 4730 | 3,5 |
| Caterpillar 797B | 380 | 3793 | 6814 | 5-6 |
| Bucyrus MT 6300AC | 363 | 3750 | 3028 | 4-5 |
| Komatsu 930E-3SE | 320 | 3500 | 4542 | каля 4 |